# Метадычны летнік настаўнікаў і метадыстаў у Альхоўцы

## Энцыклапедыя летніка ад А да Я

**Гэта адукацыйная падзея, падчас якой ствараецца асяроддзе ўзаемін, што спрыяе ўзбагачэнню ўласнага вопыту ўдзельнікаў прагрэсіўнымі педагагічнымі ідэямі, стварае ўмовы для авалодання пэўнай школьнай тэхналогіяй, дае магчымасці для творчай самарэалізацыі настаўнікаў.**

Летнік праводзіцца ў вельмі прыгожай мясцовасці на паўночным захадзе нашай краіны. Ён мае даўнюю гісторыю (больш за 30 гадоў, першы летнік адбыўся 1-6 ліпеня 1990 года) і шмат цікавых традыцый. Падрабязна з сутнасцю і асаблівасцямі гэтага адукацыйнага мерапрыемства можна пазнаёміцца з дапамогай гэтай «энцыклапедыі».

**Адукацыя для будучыні –** гэта асацыяцыя двойчы спансіравала наш летнік, пералічыўшы патрэбную ўдзельнікам летніка на харчаванне суму грошай на краму ў блізкай да Альхоўкі вёсцы – Міхалішкі. Асацыяцыя вельмі актыўна і вынікова прасоўвае ў школы і гімназіі STEM-адукацыю.

**Акадэмія паслядыпломнай адукацыі** (АПА) — гэта вучэбна-навукова-метадычны цэнтр — вядучая навучальная ўстанова ў сістэме дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў. У кастрычніку 2016 года АПА святкавала свой шасцідзесяцігадовы юбілей. АПА ўпэўнена пазіцыяніруе сябе ў адукацыйнай прасторы нашай краіны. Дзякуючы намаганням кіраўнікоў і супрацоўнікаў, яна пераўтварылася ў моцную адукацыйную ўстанову. Найбольшых поспехаў Акадэмія дасягнула ў навучанні слухачоў камп'ютарным тэхналогіям, у перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі псіхолагаў і сацыяльных педагогаў, менеджараў у сферы адукацыі, дэфектолагаў і інш. У структуры АПА працуе два факультэты, шэсць кафедраў, метадычныя цэнтры, аддзелы і ўпраўленні, аспірантура. Акадэмія — бюджэтная арганізацыя, аднак пэўную частку фінансавых сродкаў наша ўстанова зарабляе за кошт дадатковых адукацыйных паслуг. Спасылка на сайт Акадэміі http://www.academy.edu.by/

У метадычным летніку «Альхоўка» пад эгідай Акадэміі паслядыпломнай адукацыі праводзяцца аўтарскія курсы павышэння кваліфікацыі настаўнікаў і метадыстаў прафесара кафедры педагогікі і менеджмента адукацыі **Мікалая Запрудскага.**

**Акадэмія летніка** — гэта элітарны клуб яго ўдзельнікаў. Каб стаць правадзейным членам акадэміі, патрэбна дзесяць разоў пабыць у Альхоўцы. У нас ёсць урачысты рытуал пасвячэння ў акадэмікі. Яго распрацавалі **В.В. Такарская і А.А. Шалудзякова**. Пералічым паіменна нашых акадэмікаў: **А.А. Ананчыкава, Л.І. Апанасевіч, А.А. Аўсейчык, [У.А. Багамолаў], В.В. Барашкаў, А.А. Бацюлеў, С.П. Бацюлева, А.М. Валадзько, Г.М.Гадлеўская, Н.П. Гаравая, С.А. Гарбацэвіч, А.В. Гаўруковіч, В.М. Герцык, Я.М.Жвірко, У.А. Голубеў, Т.М. Граблеўская, Н.У.Дашчонак, С.В. Дзюбенка, А.А.Зайдзес, М.І. Запрудскі, П.М. Запрудскі, В.А.Званцова, Г.М. Каралёва, М.М. Катлярова, [Н.М.Кашэль], В.А. Кірэеў, Ю.І.Клімовіч, Р.У.Кунцэвіч, Н.В. Лазарэнка, Я.В. Лазарэнка, І.Р.Макатун, А.Э. Плятнёў, К.А. Пятроў, А.Л. Саковіч, У.М.Саладуха, А.Л.Сарока, А.Г. Сугакевіч, Г.А. Сухава, В.В. Такарская, Г.В. Унуковіч, Н.Г. Цішчанка, Я.У. Чабатароў, Л.М. Чыгір (Кітова), А.А. Шалудзякова, [А.А. Шуба], Ю.А. Шчасны, В.С. Шумскі, Э.М. Якубоўская, А.У. Якубоўскі.** ***(Тут і далей прозвішчы акадэмікаў выдзелены тлустым шрыфтам).***

**Актыўная ацэнка.** Ёй мы займаліся ў летніку 2010 года. Напрацавана шмат матэрыялаў, некаторыя з якіх змешчаны на сайце www.aacenka.by. Выдадзены шэраг кніг: Запрудский, Н.И. Контрольно-оценочная деятельность учителя и учащихся. – Минск: Сэр-Вит, 2012. – 170 с. Актыўная ацэнка ў дзейнасці: вопыт настаўнікаў Беларусі /М.І. Запрудскі, М.В. Кудзейка, Т.П. Мацкевіч, А.А. Радзевіч і інш. Мінск, 2014. – 324 с. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии-3. – Минск: Сэр-Вит, 2017. – 160 с. Запрудскі, М.І., Сухава, Г.А. Дыялогі пра актыўную ацэнку. – Мінск: Сэр-Віт, 2018. – 170 с. Активная оценка в образовательном процессе школы/Под ред. Н.И. Запрудского – М.: Сентябрь, 2018. - 282 с.

**Альфі.** Праводзілася з 1997 па 2003 год. Гэтае мерапрыемства нагадвае вядомыя ўсім "Оскар" і "Тэфі". Конкурсная камісія ўстанаўлівала шэраг намінацый, а потым з дапамогай апытвання насельніцтва летніка і мэтанакіраваных назіранняў вызначала намінантаў, а непасрэдна на свяце — пераможцаў. Прыгадаем некалькі намінацый: "самы аўтарытэтны фізік", "аўтар найлепшага праекта", "здаровы лад жыцця", "тонкі гумар" і інш. За гады правядзення пераможцамі Альфі сталі многія альхоўцы. Конкурс звычайна вельмі цікава і таленавіта арганізоўвалі **Зайдзес Алена**, **Званцова Вольга, Такарская Лера і Шалудзякова Аля**. У 2000 годзе **Альфі** правялі Катлярова Марына і Ракевіч Мікалай, у 2001 годзе - Клачкова Алена, Лебядзінская Вольга і Емяльянчанка Наталля, у 2002 годзе — Лебядзінская Вольга і Цімашэнка Дзмітрый, у 2003 годзе — **Валадзько Алена** і Федарына Сяргей.

**Альхоўка** — вёска ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці. Знаходзіцца на беразе Страчы, якая бярэ пачатак ад Блакітных азёраў і недалёка ад вёскі ўпадае ў Вілію. У Альхоўцы ёсць сярэдняя школа, працуе кардонная фабрыка, што вырабляе, акрамя кардону, розную тару. Яшчэ Альхоўка знакамітая тым, што, пачынаючы з 1990 года, яна становіцца месцам правядзення **метадычнага летніка настаўнікаў фізікі** (зараз – летнік настаўнікаў і метадыстаў). Летнік размяшчаецца на беразе рэчкі, на адлегласці 1 км ад школы. Пераважная большасць удзельнікаў начуе ў палатках, астатнія – у прышкольным інтэрнаце. Заняткі праводзяцца або ў школе, або ў «зяленым класе» пад спевы птушак.

**Альхоўка** – метадычны летнік: старонка ў Вікіпедыі.

**Анонс** летніка "Альхоўка-2005"

**Анонс** летніка "Альхоўка-2007"

**Анонс** летніка "Альхоўка-2008"

**Анонс** летніка "Альхоўка-2010"

**Анонс летніка** «Альхоўка-2012». Будзе праведзены на працягу тыдня, пачынаючы з другога ліпеня. Тэма курсаў у летніку «Тэорыя і практыка праблемнага навучання». Падрабязнасці чытайце ў часопісе «Фізіка: праблемы выкладання», 2012, № 2.

**Анонс** летніка "Альхоўка-2014" Вучоба без суму і прымусу За статуснымі ведамі – у Альхоўку

**Анонс** XXYI методического летника

**Анонс** XXYII методического летника

**Ананчыкава Алена.** Дырэктар СШ № 13 г. Жодзіна ім. В. Гузава, настаўніца фізікі, настаўнік-метадыст. Фіналіст конкурса “Настаўнік года”. Ментар дыстанцыйнага курса па актыўнай ацэнцы. Паспяхова распаўсюджвае свой унікальны вопыт (не толькі ў нас, яшчэ і ў Расіі). На курсах у летніку выконвае ролю кансультанта. Аўтар артыкулаў у часопісе “Фізіка”.

**Апанасевіч Леанід** — «Выдатнік адукацыі», Сорасаўскі настаўнік, былы выкладчык фізікі са школы аздараўленчага цэнтра «Зубраня». Мае адметную дыдактычную сістэму, прыкметы якой: дзейнасны падыход да навучання школьнікаў, які рэалізуецца на падставе творчых заданняў. Паспяхова займаўся арганізацыяй тэхнічнай творчасці вучняў. Леанід Іванавіч — аўтар некалькіх кніг, якія выйшлі ў АПА і ў выдавецтве «Бестпрынт». Ён здзіўляў усіх сваімі вынаходніцтвамі, якія заўседы ўпрыгожвалі і спрашчалі быт у летніку. І яшчэ Леанід Іванавіч — мастак. Яго цудоўныя пейзажы ўпрыгожваюць кватэры многіх удзельнікаў нашага летніка. Калі пачыналася наша **Акадэмія,** Леанід Іванавіч зрабіў шапкі з ватмана. Потым (з 2005 года) яны сталі палатнянымі. Іх стварала **Ларыса Чыгір.**

**Асаблівасці курсаў у Альхоўцы:** па зместу: гэта найбольш актуальная для адукацыі, для настаўнікаў тэма, якая вызначаецца з улікам іх пажаданняў; па формах і метадах правядзення вучэбных заняткаў: трэнінгавы рэжым – пэўнай тэхналогіі настаўнікі і метадысты вучацца з дапамогай гэтай жа тэхналогіі, на занятках ствараюцца ўмовы для «пражывання» удзельнікамі новай адукацыйнай практыкі; па кантынгенту: склад удзельнікаў курсаў вызначаецца не па разнарадцы, што з’яўляецца агульнапрынятым, а па папярэдніх заяўках педагогаў: настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў, метадыстаў ІРА, дырэктароў школ і іх намеснікаў, выкладчыкаў універсітэтаў і каледжаў; па месцу праведзення: заняткі праходзяць «у зяленом класе» на березе возера і ў кабінеце інфарматыкі школы, пражыванне – у прышкольном інтэрнаце і ў палатках, харчаванне – у школьнай сталоўцы (вячэра – каля вогнішча).

**Астранамічныя назіранні**. Яны праводзіліся ў дзесяці летніках пад кіраўніцтвам У.А. Голубева. Назіралі у самы вялікі ў краіне тэлескоп.

**Аўсейчык Анатоль** — настаўнік фізікі вучэбна-педагагічнага комплекса яслі-сад-сярэдняя школа аг. Адэльск Гродзенскага раёна, настаўнік-метадыст, магістр педагагічных навук па спецыяльнасці «методыка выкладання фізікі», пазаштатны лектар Гродзенскага ІРА. Вельмі цікавіцца камп'ютэрам і яго прымяненнем у выкладанні фізікі. Праяўляе вялікі інтарэс да астраноміі. Менавіта па гэтаму прадмету

мае прызёраў абласных алімпіяд. Быў ініцыятарам і арганізатарам абласных фізічных алімпіяд для вясковых школьнікаў. Ён аўтар артыкулаў у часопісе **"Фізіка: праблемы выкладання".** Мае пераможцаў конкурсаў даследчых работ і праектаў. Анатоль Аляксандравіч – заўзяты турыст, са сваімі выхаванцамі ён быў у вельмі многіх скаладаных падарожжах, агульны лік якіх набліжаецца да 250. У летніку паспяхова выконвае ролю першага памочніка **Мікалая Запрудскага**, стварыў **відэасалон,** арганізоўвае **начное арыентаванне, арганізатар экскурсій.** У 2020 годзе, калі курсы былі адменены з-за пандэміі, Анатоль Аляксандравіч усё ж такі сабраў групу настаўнікаў, для якіх наш летнік – вялікая каштоўнасць, і правёў на нашай паляне цікавую сустрэчу аднадумцаў. Ён прывозіць з сабой шмат вельмі патрэбнага для жыцця і працы ў летніку абсталявання: электрагенератар, шацёр, турыстычны рыштунак і інш.

**Багамолаў Уладзімір**. На вялікі жаль, гэты настаўнік ужо памёр. Ён — Сорасаўскі настаўнік, працаваў выкладчыкам фізікі ліцэя БДУ і ліцэя № 2 г. Мінска, член журы і аўтар задач для эксперыментальнага тура рэспубліканскай фізічнай алімпіяды. У нашым летніку праводзіў кансультацыі па рашэнні задач. Уладзімір Алегавіч — аўтар цікавых артыкулаў у часопісе **«Фізіка: праблемы выкладання».** Ён быў арганізатарам турніраў, якія штогод ладзіць экалагічная арганізацыя «Зялены крыж». Дарэчы, першы ў нашай краіне ТЮФ адбыўся ў 1990 годзе праміж вучнямі Уладзіміра Багамолава (СШ № 36), Леаніда Марковіча (ліцэй БДУ) і **Мікалая Запрудскага** (гімназія №1 ім. Ф. Скарыны).

**Барашкаў Валерый** — настаўнік фізікі Магілёўскага абласнога ліцэя № 1, народны настаўнік Беларусі, заслужаны настаўнік Беларусі, Сорасаўскі настаўнік, лаўрэат прэміі імя Н.К. Крупскай. Валерый Васільевіч — адзін з самых знакамітых настаўнікаў, яго вучні перамагалі ў алімпіядах розных узроўняў. Найбольш удалы год — 2001, калі два яго вучні прыехалі з залатым і сярэбраным медалямі з міжнароднай алімпіяды ў Турцыі. Выйшла ў свет кніга Валерыя Барашкава па навучанню вучняў 9 класа ўменням рашаць задачы па механіцы. Ён, увогуле, цудоўны чалавек, які мае шмат сяброў, умее іх берагчы і падтрымліваць.

**Бацюлевы Анатоль і Святлана** – былыя настаўнікі Астравецкай гімназіі. Анатоль – фізік, адзін з заснавальнікаў летніка. Святлана да выхаду на пенсію працавала псіхолагам і настаўніцай рускай мовы і літаратуры. Яна была сярод тых, хто пачынаў справу нашага летніка. Падтрымлівае цікавыя і карысныя пачынанні фізікаў. Дапамагала ў псіхалагічным забеспячэнні летніка. Анатоль — Сорасаўскі настаўнік, мае многа пераможцаў алімпіяд. Выступаў з цікавымі метадычнымі артыкуламі ў нашым прадметным часопісе. Мае сваю ўласную метадычную сістэму, якая грунтуецца на забеспячэнні сістэматычнай работы вучняў над вучэбным матэрыялам, прымяненні карэкцíруючага кантролю вучэбных дасягненняў школьнікаў.

**Буднік Сяргей** – дырэктар выдавецтва “Сэр-Віт”, якое амаль штогод дарыла ўдзельнікам метадычную літаратуру, а аднойчы – нават цішоткі.

**Валадзько Алена** — выкладае фізіку ў сярэдняй школе № 18 г. Магілёва. Валодала “манетным дваром”, у якім чаканіліся медалі «5 год у Альхоўцы». Мае цікавыя напрацоўкі па пазакласнай працы па фізіцы, з якімі выступала ў часопісе **«Фізіка: праблемы выкладання»,** сааўтар кніг для ўдзельнікаў конкурсаў «Зубраня», «Каласок» і «Інфамышка».

**Вежа «Міленіум»**. Яе пабудавалі з пластыкавых бутылек першагодкі 2000 года. Вышыня вежы была 8 метраў.

**Відэасалон**. Звычайна ў сераду **Анатоль Аўсейчык** запрашае на прагляд відэахронікі з папярэдніх летнікаў. Акрамя гэтага, ён дэманструе іншыя цікавыя

відэаматэрыялы. Гэта адбываецца, як сцямнее, — на нашай паляне. Зразумела, што экран мацуецца да дрэва.

**Вікіпедыя пра наш летнік**: https://be.wikipedia.org/wiki/%D0%90%D0%BB%D1%8C%D1%85%D0%BE%D1%9E%D0%BA%D0%B0_(%D0%BC%D0%B5%D1%82%D0%B0%D0%B4%D1%8B%D1%87%D0%BD%D1%8B_%D0%BB%D0%B5%D1%82%D0%BD%D1%96%D0%BA)

**Вучэбныя заняткі**. Кожны год яны праходзяць па розных тэмах (змест і працэдура атэстацыі настаўнікаў фізікі, тэхналагічны падыход да навучання, фізічны эксперымент, рашэнне задач, модульная тэхналогія, асаблівасці вывучэння фізікі на павышаным узроўні, тэхналогія педагагічных майстэрань, праектнае навучанне, даследчае навучанне, перавернутае навучанне, практыкаарыентаваныя заданні, медыяадукацыя, развіццё крэатыўнасці вучняў і інш.). Яны выклікаюць вялікую цікавасць ўдзельнікаў і, як правіла, завяршаюцца праектаваннем інавацыйных дыдактычных працэсаў для ўрокаў. Вучэбныя заняткі — гэта аўтарскія курсы **Мікалая Запрудскага**. Акрамя асноўнай тэмы, праводзяцца кансультацыі па іншых актуальных пытаннях: цэнтралізаванае тэсціраванне, новыя праграмы і падручнікі, рашэнне алімпіядных і конкурсных задач, 10-бальная сістэма ацэнкі вучэбных дасягненняў школьнікаў, камп'ютэр у выкладанні фізікі, астранамічныя назіранні і інш. Тут у ролі выкладчыкаў-кансультантаў выступалі вядомыя педагогі: **Уладзімір Багамолаў, Валерый Барашкаў, Наталля Гаравая, Уладзімір Голубеў, Ганна Гадлеўская,** Іларыён Галуза, **Святлана Дзюбенка, Ніна Кошаль, Канстанцін Пятроў, Аляксандр Саковіч, Галіна Сухава, Валерыя Такарская,** Іван Шалатонін і інш.

**Гаўрыловіч Сяргей** – дырэктар Альхоўскай школы з 2011 года. Адна з самых паспяховых школ у раёне. І настаўнікі, і вучні вельмі вынікова ўдзельнічаюць у інтэлектуальных спаборніцтвах на раённым і абласным узроўнях. Школа ўдзельнічала ў рэспубліканскіх інавацыйных праектах па мульціпрофільнаму і перавернутаму навучанню. З Сяргеем Анатольевічам у нас наладжана цеснае і прадуктыўнае супрацоўніцтва: ён актыўна і паспяхова дапамагае вырашаць практычна ўсе пытанні заняткаў і жыцця ўдзельнікаў летніка.

**Гаўруковіч Алена.** Настаўніца фізікі з Асіповіцкага раёна. Цікава, што яна адной з першых жанчын стала прыязджаць у наш летнік на сваім аўтамабілі. Была актыўнай і карыснай і на **вучэбных занятках,** і на іншых мерапрыемтвах.

**Гадлеўская Ганна** — дацэнт кафедры оптыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім. Ф. Скарыны. Яна абараніла дысертацыю па тэме «Сферычныя хвалі ў гідратропных асяроддзях»; мае больш за 50 навуковых і навукова-метадычных прац. Нягледзячы на сваю скіраванасць на фізіку, Ганна Мікалаеўна лічыць, што для сённяшняй школы важным з'яўляецца не толькі пытанне «Чаму вучыць?», але і пытанне «Як вучыць?». Таму яна актыўна працуе з настаўнікамі фізікі на курсах у Гомельскім ІРА, у летніку «Альхоўка», а таксама з вучнямі: у СШ № 56, дзе кіруе навукова-даследчай работай школьнікаў, трэніруе зборную каманду вобласці для ўдзелу ў рэспубліканскай фізічнай алімпіядзе. Яе запрашаюць у склад журы аўтарытэтных інтэлектуальных спаборніцтваў: рэспубліканскай фізічнай алімпіяды і Турніра юных фізікаў. Мае публікацыі ў прадметным журнале.

**Гаравая Наталля** працавала галоўным інспектарам упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса **«Фізіка: праблемы выкладання»**. Зараз працуе ў НІА. Падтрымлівае ўсе творчыя пачынанні фізікаў, каардынуе працы па нарматыўнаму і метадычнаму забеспячэнню выкладання фізікі, астраноміі і матэматыкі на Беларусі. У летніку праводзіла

адпаведныя кансультацыі і вельмі сур'езна ставілася да абавязкаў дзяжурнага па кухні.

**Гарбацэвіч Сяргей** – зараз настаўнік гімназіі № 21, папулярны рэпетытар. У 90-х гадах працаваў выканаўчым дырэктарам Беларускай асацыяцыі настаўнікаў фізікі, адзін з аўтараў часопіса **«Фізіка: праблемы выкладання».** Сяргея Аркадзьевіча ведаюць як пчаляра, аўтамабіліста, грыбніка, падарожніка (быў на Паміры, Чукотцы, Таймыры, Кубе, Мальдзівах…), як добрага і надзейнага партнера ў розных справах.

**Герцык Віктар**. Настаўнік з Ушачскай СШ. Валодае эфектыўнымі метадамі і сродкамі навучання, Вядучы прынцып яго педагагічнай працы – дыферэнцыяцыя навучання. Мае пераможцаў фізічнай алімпіяды: ад школьнага да рэспубліканскага ўзроўняў. Аўтамабіліст, настаўнік бальных танцаў. Вядучы на нашай **Акадэміі.**

**[Глухаў Андрэй]**. На вялікі-вялікі жаль, наш сябра трагічна загінуў. Андрэй Георгіевіч унес ў летнік шмат новых традыцый, тэхнічных новаўвядзенняў. Многія ўдзельнікі не раз плавалі на катамаране, які ён прывозіў з сабой. Ен быў інжынерам, прадпрымальнікам, падарожнікам і проста – цудоўным чалавекам.

**Голубеў Уладзімір** — старшы выкладчык кафедры методыкі выкладання фізікі і астраноміі ВДУ ім. П. Машэрава, настаўнік астраноміі гімназіі № 1 г. Віцебска. Ён працягвае справу многіх знакамітых нашых землякоў-астраномаў М. Пачобута, В. Цераскага, Г. Ціхава, О. Шмідта, Я. Зяльдовіча, А. Азімава, А. Чыжэўскага і інш. Сваёй асобай ён паказвае, што, нягледзячы на адсутнасць у нашай краіне буйных астранамічных абсерваторый, факультэтаў, якія рыхтуюць астраномаў, у беларусаў не знікае цікавасць да Сусвету, зорак, планет. Уладзімір Аляксандравіч закончыў Кастрамскі педінстытут, аспірантуру па спецыяльнасці «Методыка выкладання астраноміі» Ноўгарадскага педагагічнага інстытута. Амаль дзесяць гадоў працаваў у астранамічнай абсерваторыі Далёкаўсходняга навуковага цэнтра АН СССР. Там ён займаўся вывучэннем магнітных палёў у сонечных плямах і фізікай камет. З 1978 года жыве і працуе ў г. Віцебску. Менавіта ў нас — на Беларусі — праявіўся яго талент як папулярызатара астранамічных ведаў. Ён паспяхова працуе як са школьнікамі, так і з настаўнікамі, студэнтамі. Дзякуючы Уладзіміру Аляксандравічу, на Віцебшчыне праводзяцца астранамічныя конкурсы, а таксама рэспубліканскія астранамічныя алімпіяды. Ён сааўтар вучэбна-метадычнага комплекса па астраноміі, надрукаваў больш 15О кніг, навуковых і навукова-метадычных артыкулаў, мае пераможцаў міжнародных астранамічных конкурсаў. Выдатнік адукацыі РБ, Федэрацыяй касманаўтыкі СССР узнагароджаны медалем Ю.А. Гагарына. У летніку У.А. Голубеў арганізоўваў назіранні зорнага неба ў самы вялікі на Беларусі тэлескоп. Ён пастаянны аўтар і вядучы астранамічнай рубрыкі прадметнага часопіса. Адзін з астэроідаў названы яго імем (па ініцыятыве яго вучня В. Неўскага, які адкрыў гэты астэроід). Верагодна, што астраномія зрабіла пэўны ўплыў на асобу Уладзіміра Аляксандравіча. Сябры і калегі яго ведаюць не толькі як астранома і педагога, але і як філосафа і лірыка.

**Граблеўская Таццяна** працавала настаўніцай гісторыі Астравецкай СШ № 2. Стваральнік адзінага на Беларусі музея свайго земляка — Іосіфа Гашкевіча — слыннага падарожніка, навукоўцы, першага консула Расіі ў Японіі. Таццяна Мечыславаўна — вельмі актыўны арганізатар многіх цікавых спраў у нашым летніку, была адным з яго заснавальнікаў.

**Група на фейсбуку** “АЛЬХОЎКА: летнік настаўнікаў і метадыстаў”. **https://www.facebook.com/groups/olxovka**

**Даследчая дзейнасць** вучняў па праблеме энэргазберажэння. Да гэтага часу ўдзельнікі выкарыстоўваюць атрыманыя тут веды і ўменні пры рабоце з вучнямі. Гэта

была тэма курсаў 2008 года. Мы ўдзячны за падтрымку Нарвежскай арганізацыі “ШПДіРЭ”.

**Дашчонак Ніна** – былая настаўніцай фізікі з Расонаў Віцебскай вобласці. Аўтар нашага часопіса. Са сваімі вучнямі зрабіла ўнікальны фільм пра гукавыя з’явы. Рыбачка і пачынаючы літаратар.

**Дзюбенка Святлана**. Працавала настаўніцай фізікі ў Асіповіцкай гімназіі. У 2001 годзе паспяхова выступала ў фінале рэспубліканскага конкурсу “Настаўнік года”. Скончыла аспірантуру ў АПА, абараніла дысертацыю. Працавала на кафедры педагогікі ў АПА, потым – у маскоўскай школе. Цяпер працуе намеснікам дырэктара СШ № 19 г. Мінска імя Я.Купалы. Мае надзвычай грунтоўную падрыхтоўку па сучаснай дыдактыцы. Праводзіла заняткі на курсах у нашым летніку. У 2012 годзе замяніла на занятках па тэме праблемнага навучання **Мікалая Запрудскага,** які ў той год не змог прыехаць у **Альхоўку.** Аўтар кніг, артыкулаў у прадметным журнале.

**Дошка гонару ў часопісе “Фізіка”**. На ёй змешачаны многія ўдзельнікі нашага летніка: Віктар Мацецкі, [Юрый Ляшчынскі], **Леанід Апанасевіч, Анатоль Аўсейчык, Анатоль Бацюлеў,** Анатоль Слабадзянюк, **Уладзімір Голубеў**, **Ганна Гадлеўская, Аляксандр і Эла Якубоўскія,** Іпаліт Аўдзей, Генадзь Няхай, **Аля Шалудзякова, Раіса Кунцэвіч,** Наталля Емельянчык, **Юрый Шчасны, Наталля Лазарэнка, Галіна Унуковіч,** Сяргей Федарына, Ганна Андрэева, **Алена Валадзько, Аляксандр Плятёў, Аляксандр Сугакевіч,** Аркадзь Шуб, Раіса Балюк, Наталля Тамашэвіч, Уладзімір Паддубскі, Іларыён Галуза, Святлана Красікава, **Вольга Званцова, Аляксандр Саковіч,** Алег Купрацэвіч, **Віктар Герцык, Ніка Цішчанка, Уладзімір Багамолаў,** Іван Кульбеда, **Алена Гаўруковіч, Алена Сарока**, Генадзь Пальчык, Віктар Кротаў, Аляксандр Сядзяка, **Алена Ананчыкава,** Ала Сініца, Анатоль Чэпік, Дзмітрый Бондар, **Валерыя Такарская**, Жана Скачко, Сяргей Цімашук, Сяргей Гусеў, Святлана Ерамеева, **Віктар Кірэеў, Таццяна Ждановіч,** Андрэй Хвалінскі, Святлана Здаранкова, Таццяна Афанасік, Сяргей Яшчанка.

**Дыпломы** ўручаюцца нашым юбілярам (5, 15, 20, 25, 30 разоў ў летніку), а таксама тым, каго выбіраем у склад Акадэміі, хто становіцца акадэмікам. Дыпломы выраблялі **Аляксандр Саковіч** і Анатоль Шчыракоў. Апошнія гады — Сярей Цімашук.

**Дзяжурства на кухні і ў сталовай.** Кожны сам выбірае дзень для гэтай ганаровай працы. У 2019 годзе **Сяргей Гарбацэвіч** стварыў каманду дзяжурных з адных мужчын. Гэта было незвычайна. І, трэба сказаць, яны добра справіліся з абавязкамі: усе ўдзельнікі былі накормлены, а посуд – вымыты.

**Жвірко Яўген.** Настаўнік фізікі ў школе алімпійскага рэзерву (г. Ліда). Калі Жэня прыязджаў да нас у Альхоўку, то вельмі спрыяў стварэнню крэатыўнай атмасферы. Яго песні і жарты вельмі падабаліся ўдзельнікам. Цікавы факт: жонку Ірыну Дзмітрыеву ён знайшоў менавіта ў нашым летніку.

**Зайдзес Алена** — прадстаўляе СШ № 4 г. Салігорска. Праяўляе вялікую цікавасць да кіраўніцтва навукова-даследчай творчасцю школьнікаў, яе вучні ўдзельнічаюць у турнірах юных фізікаў, прывозяць дыпломы з рэспубліканскіх навуковых вучнёўскіх канферэнцый, удзельнічалі ў навукова-даследчай фізіка-матэматычнай школе ў Лужасне. Алена Аляксандраўна друкавала свае матэрыялы на старонках часопіса **«Фізіка: праблемы выкладання»**, яна цудоўная спявачка, была арганізатарам знакавых мерапрыемстваў летніка: **«Альфі», «Акадэмія»** і інш.

**Запрудскі Мікалай —** стваральнік і кіраўнік летніка, прафесар кафедры педагогікі і менеджмента адукацыі **Акадэміі паслядыпломнай адукацыі**, 3 1995 года галоўны рэдактар часопіса **«Фізіка»,** аўтар і сааўтар амаль 30 кніг і мноства артыкулаў, Сорасаўскі настаўнік, выдатнік адукацыі.

**Запрудскі Павел** — выпускнік кафедры энергетыкі фізічнага факультэта БДУ, потым атрымаў акадэмічную ступень магістра па спецыяльнасці «Менеджмент інфармацыйных сістэм». Цяпер працуе бізнескансультантам у буйной кансалтынгавай кампаніі. Ён разам з **Анатолем Аўсейчыкам** правялі першае ў нашым летніку **начное арыентаванне.**

**Званцава Вольга** — настаўніца фізікі Мінскага абласнога ліцэя, настаўнік-метадыст. Яна з поспехам прымяняе інтэгральную тэхналогію адукацыйнага працэсу, якой авалодала на аўтарскіх курсах **Мікалая Запрудскага**. Вольга Аляксандраўна вельмі таленавітая жыхарка летніка, яна прыгожа ўпісываецца ў яго адукацыйную прастору са сваімі ідэямі, вершамі і спевамі. Аўтар артыкулаў ў часопісе. Вядучая нашай **Акадэміі.**

**Заяўкі на курсы** ў летнік дасылаюцца ў тэрміны, якія ўказаны ў сакавіцкім нумары часопіса «Фізіка», на сайце АПА, на сайце nastaunik.info, у групе **АЛЬХОЎКА: летнік настаўнікаў і метадыстаў**. Ніжэй прыводзім мікст выняткаў з пісьмаў-заявак на ўдзел у летніку 2002 года: «…жадаю бліжэй пазнаеміцца з метадам праектаў, жадаю ў Альхоўку, жадаю сустрэцца з сябрамі, аднадумцамі, жадаю спрачацца, абмяркоўваць, удзельнічаць, вучыцца, жадаю авалодаць метадам праектаў, жадаю ідэй, адчуць кавалачак (дакладней, вялікі кус) шчасця, аддаць свае сілы, свае напрацаваныя вышукі, паглыбіцца ў галавакружную дзейнасць з элементамі фізікі і прыгажосці, авалодаць дадзенай тэхналогіяй для далейшага прымянення на ўроках фізікі, удыхнуць свежага паветра ў фізічна-лірычным братэрстве, жадаю быць кампетэнтнай пры рабоце са студэнтамі, хочацца атрымаць эмацыянальны штуршок і стымул для далейшай працы, авалодаць метадам праектаў, павучыцца ў лепшых настаўнікаў Беларусі, крышачку праявіць сябе» і г.д.

**Ідэя** правядзення летніка належыць **Анатолю Бацюлеву** і **Мікалаю Запрудскаму**. Яна ўзнікла падчас дэсанту вядомых настаўнікаў фізікі краіны ў г. Гродна (2 кастрычніка 1989 года).

**Інтэгральная адукацыйная тэхналогія —** тэма аўтарскіх курсаў у летніку 2003 года. Гэта вельмі прыдатная для выкладання фізікі тэхналогія; яна інтэгруе, па-першае, асобасна-арыентаваны, і прадметны падыходы; па-другое, — новыя ідэі ва ўласны досвед педагогаў. Тэхналогія, аўтар якой В.В. Гузееў, будуецца на наступных навуковых падставах: 1) узбуйненне дыдактычных адзінак, 2) псіхалагізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу, 3) дыягнастычнае мэтавызначэнне, 4) камп'ютар як сродак навучання. Падрабязна пра дадзеную тэхналогію можна прачытаць у кнігах: Гузеев, В.В. Теория и практика интегральной образовательной технологии. - М., 2001. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии. - Мн., "Сэр-Вит", 2003. http://pdf.kamunikat.org/28135-1.pdf.

**Казак Віктар** – дырэктар Міхалішкоўскай СШ Астравецкага раёна, настаўнік інфарматыкі. Школа, якой ён упраўляе, з’яўляецца адной з лепшых у раёне. У ёй рэалізаваны інавацыйны праект па тэхналогіі перавернутага навучання. Вялікі сябра нашага летніка. Штогод бясплатна прадстаўляе нам аўтобус, каб забраць з чыгуначнай станцыі ўдзельнікаў, якія едуць не сваім транспартам, а на завяршэнні летніка — адвезці іх да цягніка. Сам і некаторыя яго педагогі наведвалі нашы заняткі і мерапрыемствы.

**Каманды летніка.** Звычайна іх тры. Апошнія гады гэта: **першагодкі**, сярэднякі і ветэраны. (Удалая знаходка-99: каманду маладых умацаваць **Валерам Барашкавым**). У склад гэтых каманд уваходзіць амаль усё насельніцтва летніка; для тых або іншых спаборніцтваў з каманд вылучаецца па 3-5 чалавек. У 1993 годзе была каманда гуманітарыяў, якой удалося перамагчы фізікаў.

**Канцэрт першагодкаў.** Праводзіцца штогод у дзень закрыцця летніка. І заўседы першагодкі здзіўляюць усіх сваім талентам, цікавымі імправізацыямі, спевамі і гумарам.

**Каралёва Ганна** — магістр педагагічных навук, настаўніца фізікі СШ № 3 г. Мінска. Авалодала бухгалтарскай справай і працавала на грамадскіх пачатках бухгалтарам у Беларускай асацыяцыі настаўнікаў фізікі.

**Карыда зуброў.** Інтэлетуальны турнір 1992 года. Зубрамі былі добрыя фізікі, яны спаборнічалі ў адказах на фізічныя пытанні. Перамог **Сяргей Гарбацэвіч,** які, у прыватнасці, вельмі талкова патлумачыў, чаму асінавыя лісты, у адрозненне ад лісця іншых дрэў, трапечуцца ад ветру. Натуральна, што прызам з'яўлялася бутэлька "Зуброўкі", якую выйграў гэты настаўнік.

**Катлярова Марына.** Працавала настаўніцай фізікі, потым — метадыстам па фізіцы Гомельскага ІРА, затым – намеснікам дырэктара Гомельскага філіяла інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у галіне газазабеспячэння "ГАЗ-ІНСТЫТУТ", зараз — заведуе Гомельскім аддзяленнем МІПКіПК БНТУ. Друкавала артыкулы ў часопісе "Фізіка" і іншых выданнях. Праяўляла актыўнасць на вучэбных занятках і на іншых мерапрыемствах летніка.

**Кацільен.** Праводзіўся да 2019 года. Калі ўдзельнікі прывозілі з сабой вячэрнія сукенкі і фракі, то яны патрэбныя былі менавіта да гэтага свята. Кожны выбіраў сабе ролю, імя, рыхтаваў адпаведны строй, рабіў макіяж. У 2001 годзе кацільен праводзіўся па французскіх матывах (паколькі курсы ў летніку прысвячаліся тэхналогіі французскіх педагагічных майстэрань); у 2002 годзе — па галівудскіх (мы займаліся праектным навучаннем, асновы якога вызначыў амерыканскі педагог Дж. Дзьюі). У 2003 годзе свята мела беларускія характэрныя рысы (прадмет вывучэння — мадыфікаваны на Беларусі варыянт інтэгральнай тэхналогіі). Спачатку аўтарамі сцэнарыя і гаспадарамі балю былі **Аля Шалудзякова і Анатоль Шуба**, потым **Яўгенія Лазарэнка** і **Анатоль Шуба.** Было выключэнне: у 2011 годзе адбыўся «Шляхецкі баль», на якім госці дэманстравалі і тлумачылі свае гербы. Вядучымі на балі былі **Галіна Сухава і Яўген Жвірко.**

**Кірэеў Віктар** – настаўнік з Быхава. Дасканала валодае камп'ютарам. Надзвычай карысны ў летніку чалавек. Аўтар нашага часопіса. Мае хобі – займаецца пчалярствам.

**Клімовіч Юрась**. Працуе ў 8-й школе г. Ліда. Аўтар сшыткаў для лабараторных работ па фізіцы, якія атрымалі грыф Міністэрства адукацыі. Мае хобі – тэарэтычна займаецца пчалярствам. У адным з летнікаў устанавіў рэкорд – перавёз на сваім «Опелі» найбольшую колькасць удзельнікаў.

**Конкурс на права прыехаць на курсы ў летнік.** Для удзелу ў конкурсе патрэбна напісаць заяўку па ўстаноўленай форме на адрас **Мікалая Запрудскага. Анонс** і форма заяўкі змешчаюцца на сайце АПА, у часопісе **«Фізіка»**, на сайце www.nastaunik.info, у **групе "АЛЬХОЎКА: Летнік настаўнікаў і метадыстаў".** У конкурсе перавагай карыстаюцца тыя, хто заявіўся ўпершыню. Пажадана, каб прэтэндэнт выбраў варыянт начлегу ў палатцы, а не ў школе. Фізікам быць не абавязкова.

**Кошаль Ніна.** На вялікі жаль, яна ўжо памерла. Працавала загадчыцай кафедры ўпраўлення ў сферы адукацыі ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. Аўтар шматлікіх кніг і артыкулаў, якія прысвечаны актыўным метадам навучання, праблемам якасці адукацыі, павышэння кваліфікацыі і экалогіі. Аўтар і арганізатар шматлікіх адукацыйных праектаў. Удзельнічала ў правядзенні заняткаў у летніку, прысвечаных модульнай тэхналогіі. Кансультант і памочніца для педагогаў, якія займаліся навуковай дзейнасцю. Некалькі разоў праводзіла летнікі, падобныя нашаму, з кіраўнікам ўстаноў адукацыі.

**Крэатыўнасць настаўніка як умова развіцця творчых здольнасцей вучняў** (дыстанцыйна-вочны фармат). Гэта тэма курсаў у летніку 2021 года. Падрабязнасці можна прачытаць у часопісе **«Фізіка»** (2021, № 4, артыкул **Мікалая Запрудскага**).

**Крыжаванка —** тут прапануецца "Крыжаванка", якую склаў выкладчык фізікі з ліцэя БРУ (Магілёў) **А.Г.Сугакевіч.** Вы маеце магчымасць праверыць сваю дасведчанасць адносна асоб і падзей у летніку.

**Кунцэвіч Раіса.** Метадыст Клічаўскага раённага вучэбна-метадычнага кабінета. Былая настаўніца фізікі Дзмітраўскага ВПК "Дзіцячы сад-сярэдняя школа". У нашым летніку праяўляла актыўнасць на занятках, дапамагала ў падрыхтоўцы мерапрыемстваў, была адказнай за харчаванне ўдзельнікаў, доўгі час шыла шапкі **акадэмікам.**

**Купалле**. Свята праводіцца па тых традыцыях, якія складаліся стагоддзямі: скачкі праз вогнішча, зёлкі, папараць-кветка і інш. Вядучымі на свяце бывалі Мікалай Атрахімовіч, **Тамара Мацкевіч, Галіна Унуковіч, Юрась Шчасны,** Юрась Каласоўскі, Юля Некраш, Наталля Літвіновіч, Юля Паўлава, Алена Лемантовіч і інш.

**Лагатып летніка.** Вы яго бачыце ў самым пачатку энцыклапедыі. Быў аб'яўлены конкурс на лепшую эмблему. Ад членаў нашай суполкі паступіла 16 варыянтаў. **Аляксандр Плятнёў** пагадзіўся і правёў электроннае галасаванне. У выніку з вялікім адрывам ад іншых перамог Сяргей Цімашук з Беражноўскай школы Столінскага раёна.

**Лазарэнка Наталля** – былы метадыст па фізіцы Магілеўскага абласнога ІРА. Наталля Васільеўна вельмі ініцыятыўны педагог. Яна арганізавала ў сваім інстытуце шмат цікавых і карысных курсаў, канферэнцый, якія былі прысвечаны засваенню і прымяненню настаўнікамі сучасных адукацыйных тэхналогій. Яна таксама правяла некалькі, падобных на наш, летнікаў для настаўнікаў Магілеўскай вобласці. Наталля — трэнер па НЛП. А яшчэ яна піша цудоўныя вершы.

**Лазарэнка Яўгенія** – працуе метадыстам па фізіцы Магілёўскага ІРА. Цікавы і творчы работнік. Яна праводзіць для настаўнікаў фізікі вобласці (і не толькі Магілёўскай) унікальны летні семінар на возеры Хатомля. Прыемна, што гэты семінар нагадвае наш альхоўскі летнік. Аўтар артыкулаў, якія надрукаваны ў журнале **«Фізіка».**

**Лазня.** Размяшчаецца ў палатцы. Арганізуецца, як правіла, ў 16 гадзін чацвярга. Працэсам кіруе **Аляксандр Якубоўскі.** Суправаджаецца купаннем у Страчы. Рабіць лазню пачынаў Ігар Волкаў са Жлобіна.

**Мадэліраванне і праектаванне аўтарскіх дыдактычных сістэм —** назва курсаў павышэння кваліфікацыі настаўнікаў і метадыстаў, якія адбыліся ў юбілейным — 15-м летніку (2004 год). Далучаем артыкул пра гэтыя курсы, які падрыхтавала метадыст Гомельскага ІРА А.В.Філатава.

**Макатун Ігар** — інжынер-кампутаршчык з **Акадэміі паслядыпломнай адукацыі**. Калі ён да нас прыязджаў, то ажыццяўляў кампутарную падтрымку курсаў у летніку, а таксама таленавіта выконваў розныя незвычайныя ролі ў шматлікіх мерапрыемствах другой паловы дня.

**Мацкевіч Тамара**. Фізік, наменік старшыні Таварыства беларускай школы. Па яе ініцыятыве і дзякуючы яе прадуктыўнай дзейнасці ў школах нашай краіны распаўсюджваецца вельмі эфектыўная тэхналогія навучання – актыўная ацэнка (на Захадзе і ў Расіі яна называецца фарміруючым ацэньваннем) і медыяадукацыя. Тамара Пятроўна адмініструе вельмі карысныя для настаўнікаў сайты www.aacenka.by і www.nastaunik.info. Дзякуючы ёй, у нас рэалізуецца ўнікальны метадычны праект – EdCamp Belarus. Яна аўтар артыкулаў у нашым прадметным журнале. Увогуле – цудоўны чалавек.

**Медалі** ўручаліся (адначасова з выбарамі ў **Акадэмію**) тым удзельнікам, што прыехалі ў летнік у пяты, дзясяты, пятнаццаты раз. Іх прадстаўляў “Манетны двор” **Алены Валадзько**, а потым — Вольгі Лебядзінскай. Затым медалі замянілі дыпломамі, якія ствараў спачатку **Аляксандр Саковіч,** а зараз робіць Сяргей Цімашук.

**Метадычная работа** ў школе як механізм прафесійнага развіцця настаўнікаў. Тэма курсаў у летніку 2017 года. Матэрыялы з заняткаў ў значнай ступені абагульнены ў кнізе: Запрудский, Н.И. Сухова, Г.А. Эффективные практики методической работы в школе. – Минск: Сэр-Вит, 2022. – 172 с.

**Метадычны летнік настаўнікаў фізікі: 20 год гісторыі**. Так называецца кніга, складальнікамі якой сталі **Аляксандр Плятнеў і Аляксандр Сугакевіч**, а рэдактарам –- **Мікалай Запрудскі**. Кніга выдадзена ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі ў 2009 годзе. Раім пачынаць яе чытаць з апошняй старонкі – Заключэння, а потым вярнуцца да пачатку кніжкі.

**Модульная тэхналогія навучання —** вывучалася ў летніку 2000 года. Яна будуецца на падставе тэорыі паэтапнага засваення разумовых дзеянняў, кібернетычнага падыходу; ўлічвае індывідуальны тэмп засваення вучэбнага матэрыялу. Настаўнік прымяняе два механізмы ўпраўлення дзейнасцю вучняў: непасрэдна і праз модуль. У модулі прапісаны вучэбныя элементы, змест дзейнасці вучняў і парады, указанні педагога. У той раз, акрамя аўтара курсаў, некаторыя заняткі праводзіла **Ніна Кошаль**.

**Настаўніцкая газета** — перыядычнае педагагічнае выданне, якое з’яўляецца інфармацыйным спонсарам нашага летніка, якое амаль штогод друкуе артыкулы пра летнік у **Альхоўцы**. Аўтарамі былі Ганна Андрэева, **Марына Катлярова,** Святлана Кірсанава, Георгій Клябанаў, Юлія Некраш, Галіна Сідаровіч, **Галіна Унуковіч,** Людміла Шаматранава і інш.

**Нашы пераможцы**. Мы можам ганарыцца тым, што нашы калегі-альхоўцы перамагалі ў конкурсах «Настаўнік года-2004» (Ігар Якіменка – пераможца, Зміцер Мацкевіч – дыплом першай ступені), «Настаўнік года-2009» (Алег Купрацэвіч – дыплом першай ступені; **Галіна Сухава** – дыплом трэцяй ступені; Вікторыя Бандарэнка – суперфіналіст); «Настаўнік года-2011» (Іван Якіменка, Дзмітрый Шыц – суперфіналісты); «Адкрыты ўрок-2010» (**Аляксандр Якубоўскі** – гран-пры, **Аляксандр Плятнеў** – фіналіст); «Ноўтбук для актыўнага настаўніка-2009» (**Аляксандр Плятнеў** – першае месца ў адной з намінацый); «Ноўтбук для актыўнага настаўніка-2010» (**Галіна Сухава),** Захар Якубоўскі – пераможца рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў даследчых работ.

**Начное арыентаванне** ў лесе. Упершыню праведзена ў сёмай Альхоўцы. Для гэтых спаборніцтваў **Анатоль Аўсейчык, Паша Запрудскі** і Іван Таўрогінскі спецыяльна падрыхтавалі тапаграфічную карту. Яна была даволі дакладна зроблена, бо, ў рэшце рэшт, удзельнікі заўседы знаходзілі пікеты і яшчэ гэтай жа ноччу вярталіся ў летнік. Тут начальнік дыстанцыі і галоўны суддзя спаборніцтваў — **Анатоль Аўсейчык.** Зараз пры правядзенні начнога арыентавання выкарыстоўваюцца тапаграфічныя карты, зробленыя на аснове касмічных здымкаў мясцовасці.

**Няхай Генадзь**. Старшыня асацыяцыі «Конкурс» (зараз – намеснік старшыні), якая праводзіць «Зубраня», «Кенгуру» ды іншыя інтэлектуальныя гульні. Мы вельмі рады, калі Генадзь Уладзіміравіч прыязджае да нас у летнік з кніжнымі падарункамі для ўдзельнікаў. Але гэта бывае не заўсёды, бо ў гэты ж час ён звычайна ўдзельнічае ў чэмпіянатах свету па спартыўным арыентаванні.

**Ойра –** народны танец, які з захапленнем танчаць удзельнікі летніка пад час вячэрняга адпачынку, на Купаллі.

**Палёты на паветраным шары** былі тройчы (1999, 2000, 2002 гады). Вы ўяўляеце сабе, наколькі цудоўна з вышыні палету птушкі паглядзець на навакольныя краявіды, на вадасховішча, на Страчу, на Альхоўку, на тых, хто ўнізе чакае чаргі для палёту?!. Гэта фантастычна! Як выказаліся некаторыя фізікі: "Гэта быў цудоўны фізічны дослед", за які вялікая наша падзяка **Анатолю Шубу**, Алегу Давыдзенку і Аляксандру Фірсакову.

**Піянеры летніка,** што першымі ў 1990 годзе прыехалі ў Альхоўку: **Апанасевіч Леанід**, Балюк Раіса, **Барашкаў Валерый**, Батура Леанід, **Бацюлеў Анатоль**, **Бацюлева Святлана**, Бацюлева Наталля, Валочнік Людміла, **Гаравая Наталля**, **Граблеўская Таццяна,** [Глушчанка Сяргей], **Запрудскі Мікалай**, Казіміраў Міхаіл, Кісялева Альбіна, Клябанаў Георгій, [Ступакоў Уладзімір], Субач Мікалай, **Шчасны Юрый**, **Унуковіч Галіна, Чабатароў Яўген**, Шуб Аркадзь, **Шумскі Віктар**.

**Першагодкі.** Гэта тыя настаўнікі, якія ўпершыню прыязджаюць у наш летнік. Дакладна: кожны з удзельнікаў калісці прыехаў у Альхоўку ўпершыню. Зараз ёсць тыя, хто тут быў 30 разоў, і тыя, хто адзначыўся толькі аднойчы. Вельмі шмат удзельнікаў захварэлі на летнік і імкнуцца папасці сюды кожны год.

**Плабут**. Сутнасць гэтых спаборніцтваў вынікае з назвы: плаванне з пластыкавымі бутэлькамі. З іх рабілі плыты, на якіх плавалі за прызам (перамагла каманда **Сяргея Гарбацэвіча**), рабілі водныя лыжы, лодку, падвескі і інш. Чакайце, магчыма, тут у наступным летніку сюрпрызаў ад **Анатоля Аўсейчыка.** Дарэчы, пластыкавыя бутэлькі прымяняліся яшчэ як фізічныя прылады на нашым фізічным турніры, з бутэлек мы рабілі кеглі ў нашым кегельбане, розныя ўпрыгожванні, яны былі мішэнямі, вымяральнымі прыладамі, падсвечнікамі, будаўнічым матэрыялам пры ўзвядзенні **"вежы веку"** і інш.

**Плятнёў Аляксандр** працуе ў ліцэі пры Беларуска-Расійскім універсітэце, настаўнік-метадыст. Аўтар артыкулаў у часопісе **«Фізіка»**, адзін з арганізатараў **«**Фестывалю навукі**»**, які ладзіцца ліцэем і ўніверсітэтам; арганізатар галасавання на лепшы **лагатып летніка.**

**Правілы альхоўцаў:**

1. Альхоўцы шануюць **традыцыі летніка.**
2. Альхоўцы не спазняюцца на заняткі**. Вучэбныя заняткі** — прыярытэт.

3. Для альхоўцаў дзяжурства па прыгатаванні ежы — любімая справа і справа гонару.
4. Альхоўцы падтрымліваюць чысціню і парадак у летніку.
5. Альхоўцы памятаюць, што купанне ў возеры звязана з пэўнай рызыкай.
6. Прагулка ў лес — дровы для вогнішча.
7. Норма для альхоўцаў: гатоўнасць для дапамогі калегам.
8. Усё робіцца дабраахвотна ў абавязковым парадку.
9. Альхоўскі дэвіз: "Я хачу, я магу, я зраблю".

**Праектнае навучанне —** гэта тэма, якой быў прысвечаны летнікі 2002 і 2019 (дыстанцыйна-вочны фармат) гадах. Падчас курсаў іх удзельнікі не толькі авалодалі тэарэтычнымі асновамі метада праектаў, але і стварылі свае адукацыйныя праекты. Сутнасць метада заключаецца ў тым, што вучань у працэсе работы над праектам вывучае рэальныя працэсы і аб'екты. Пры гэтым ён пражывае канкрэтныя сітуацыі выбару, пошуку, даследавання, ацэнкі, прэзентацыі і г.д., а настаўнік арганізуе знешнюю і ўнутраную актыўнасці вучняў, стварае ўмовы для іх развіцця. Праектнае навучанне мае на ўвазе стварэнне сітуацый свабоднанага выбару: тэмы праекта, яго падтэмы, партнераў для сумеснай працы, крыніц для пошуку інфармацыі і г.д.

**Прафесійная самапрэзентацыя.** Праводзіцца з 1990 года. Яна адбываецца на другі дзень. Кожны з удзельнікаў прадстаўляе свае напрацоўкі, бачанне праблемы, якая адпавядае тэме летніка. Гэта стварае ўмовы для прафесійных зносін, абмену вопытам.

**Прынцып свабоды**. Так было заўсёды. Усё адбываецца так, што ўдзельнікі самі вызначаюць стратэгію і тактыку сваіх паводзін, прымаюць рашэнне аб удзеле ў тым або іншым мерапрыемстве, але ўсе абавязкова падпарадкоўваюцца рэгламенту летніка.

**Пятроў Канстанцін**. Намеснік начальніка ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы АПА, намеснік галоўнага рэдактара часопіса “Фізіка”, арганізуе дзейнасць рэспубліканскй творчай групы настаўнікаў фізікі, аўтар прадметнага журнала, сааўтар кніг “Настольная кніга настаўніка фізікі”, “Эксперыментальныя даследаванні вучняў”.

**Рэкорды летніка.** Іх рэгістрацыя праводзілася ўжо шмат разоў.

У **1998** годзе гэта зрабіў Аляксей Паўлаў:

· знайдзены самы прыгожы падасінавік (**Лера Такарская**);
· знойдзена 34 баравікі (**Аля Шалудзякова, Лера Такарская**);
· першая жанчына, якая засталася ахоўваць летнік (**Алена Валадзько);**
· за 18 мінут парэзаў на дровы 0.5 куб.м. лесу **(Уладзімір Голубеў);**
· два разы падняўся ў неба на паветраным шары **(Уладзімір Голубеў);**
· чэмпіен па армрэслінгу (**Анатоль Аўсейчык**);
· самы прыгожы мужчынскі касцюм на кацільёне (Аляксандр Чарнюк);
· самы працяглы камплімент жанчыне пад час кацільёна **(Сяргей Гарбацэвіч**);
· адзіны чалавек, які абедае з дапамогай кітайскіх палачак (**Анатоль Шуба);**

У **1999 - 2000** годах рэкорды рэгістрыраваў **Юрый Шчасны.**

**1999** год:

· злоўлены вугор даўжыней 74 см (Павел Шалудзякоў);
· зроблена самая вялікая (80 см) драўляная лыжка (Аляксандр Журба),
· самы кемлівы лодачнік: пакатаў за два дні 11 жанчын (**Леанід Апанасевіч),**

· самыя познія паветраныя падарожнікі - 23 г.35 м. **(Вольга Званцова, Наталля Лазарэнка, Лера Такарская** і пілот Фірсакоў Аляксандр).

**2000** год:

· самы доўгі шлях у Альхоўку - 535 км — (**Аля** і Паша **Шалудзяковы**);
· рэкорд па чыстцы рыбы — уся, што была - (**Ніна Дашчонак**);
· паходы з летніка ў інтэрнат за адну ноч — тры — (Хведар Бардзілоўскі);
· самая высокая **вежа** з пластыкавых бутэлек **—** амаль 8 метраў **–** (першагодкі);

**2001** год (рэгістрацыя ў выкананні Ганны Андрэевай):

· першы год, калі ў палатках жыве ў 1.5 разы больш людзей, чым у інтэрнаце;
· у два разы ў летніку стала больш прыгожых жанчын з прозвішчам **Лазарэнка;**
· ні разу не хадзіў харчавацца ў сталовую, таму менавіта так прыгожа знешне выглядае **(Анатоль Аўсейчык**);
· за ўсе альхоўскія летнікі самае шумнае наваселле (**Сяргей Гарбацэвіч** і Іван Шалатонін);
· першае начное купанне з компасам і картай падчас правядзення начнога арыентавання;
· самая працяглая лоўля рыбы з парным падзеннем у балота (**Валера Барашкаў** і Іван Шалатонін), сведкі – **Яўген Чабатароў** і жыхары вескі Радзюшы;
· самая позняя чыстка шчупака і самы ранні сняданак - у 4 гадзіны раніцы - (**Ніна Кашэль** і яе сябры);
· самая вялікая балонка (Арчы Анатольевіч);
· два прыезды ў Альхоўку за адзін сезон (Пётр Шумскі).

**2002** год (Алена Несцярук):

· парушана адна з фундаментальных заканамернасцей прыроды: час пайшоў назад (на 257 с) у спаборніцтваў на **фізічна-спартыўнай паласе перашкод;**
· чалавек, дзякуючы якому вельмі многае ў летніку атрымалася (**Ларыса Чыгір-Кітова);**
· пікет на **начным арыентаванні**, якога не было (Мікалай Давыдаў і Аляксандр Казакевіч);
· чалавек, які бывае ў летніку да яго пачатку (Шалатонін Іван).

**2003** год (Уладзімір Падддубскі):

-"Хапае на лёце" - Сяргей Федарына.
- "Ужасцік Альхоўскі" – **Уладзімір Саладуха**.
- "Гігант думкі" – **Мікалай Запрудскі**.
- "На сваёй хвалі" – Міхаіл Макаед.
- "Толькі быў і раптам знік" – Аляксандр Журба.
- "Проста зорка" – **Ганна Гадлеўская.**

**2004** год:

- Роўна ў два разы ў летніку павялічылася колькасць кампутараў.
- За тыдзень тры разы прыязджаў у летнік (**Анатоль Шуба)**
- Упершыню на нашай паляне працавала **лазня** (Ігар Волкаў)
- На небывалы ўзровень былі падняты праблемы экалогіі (Ігар Волкаў, Уладзімір Чачэнін)
- Зроблена небывалая колькасць фотаздымкаў (Ганна Андрэева, **Аляксандр Плятнеў).**

Апошнім часам рэконды фіксуе, вельмі прыгожа, і з тонкім гумарам іх аб'яўляе Сяргей Цімашук.

**Саковіч Аляксандр**. Працуе ў Магілеўскім абласным ліцэі № 1. Падрыхтаваў многа пераможцаў алімпіяд (ад раеннай да рэспубліканскай), трымальнік вельмі карыснага сайта «Школьная фізіка», на якім змяшчае, у прыватнасці, артыкулы нашага часопіса, аўтар часопіса. Галоўны відэааператар Альхоўкі.

**Саладуха Уладзімір** – ужо былы настаўнік фізікі СШ №2 г.Слуцка, кіраўнік метадычнага аб'яднання фізікаў. Жаданы для ўсіх партнёр цікавых спраў у летніку, надзейны сябра і "авантурыст" у **начным арыентаванні**.

**Сарока Алена.** Былая настаўніца фізікі са Слоніма. Зараз займаецца рэпетытарствам. Аўтар нашага часопіса. Была актыўнай у многіх справах нашых курсаў і летніка. Выгадавала вельмі паспяховую дачушку Таццяну Афанасік – настаўніцу з гімназіі Слоніма, якая прыязджае да нас у летнік.

**Спонсары** летніка ў розныя гады: **Альхоўская СШ, Міхалішкоўская СШ,** Астравецкі аддзел адукацыі, Міжнародная Сорасаўская адукацыйная праграма ў галіне дакладных навук, Інстытут «Открытое общество», Альфа-радыё, Вера Руцкая, Вольга Лебядзінская, грамадзянін Германіі Клаус..., Выдавецтва «Сэр-Віт» – Сяргей Буднік, Асацыяцыя «Конкурс», грамадскае аб'яднанне ЭКАДОМ, **Асацыяцыя «Адукацыя для будучыні»,** ШПДіР. Мы вельмі цэнім Вашу дапамогу, сябры. Шчырая Вам падзяка ад усіх удзельнікаў.

**Страфіз.** Гэты акронім азначае: фізічная алімпіяда ўдзельнікаў на беразе Страчы. Праводзілася ў 1992 – 1994 гадах.

**Страча** – маляўнічая рэчка агульнай даўжынёй 59 км, якая пачынаецца ад Блакітных азёраў. За два кіламетры да яе ўпадзення ў Вілію зроблема плаціна. На беразе вадасховішча размяшчаюцца вёска і наш летнік. Некалькі разоў ад моста (дарога Полацк – Вільня) па гэтай рацэ сплаўляліся на лодках "начальнік" летніка і два **Анатолі – Аўсейчык і Шуба.**

**Сунічны букецік.** Каб быў конкурс на лепшы букет, які кавалер падорыць сваёй даме пад час **кацільёну,** то перамога была б за **Сяргеем Гарбацэвічам.** Гэта было вельмі незвычайна, прыгожа і кранальна.

**Супрацоўніцтва і ўзаемнае навучанне настаўнікаў** як эфектыўны механізм прафесійнага развіцця. Тэма будучых курсаў у летніку 2022 года.

**Сугакевіч Аляксандр.** Працуе ў ліцэі БРУ (г. Магілёў). Не толькі вельмі добры фізік, але яшчэ захапляецца астраноміяй. Друкуе артыкулы ў нашым прадметным журнале. Стварае цікавыя **крыжаванкі** пра наш летнік.

**Сухава Галіна** – настаўніца беларускай мовы і літаратуры гімназіі № 5 г. Віцебска, настаўнік-метадыст, выдатнік адукацыі, лаўрэат конкурсу "Настаўнік года-2009", член клуба "Крыштальны журавель" і аб'яднання настаўнікаў-метадыстаў "Імкненне". Сааўтар трох кніг па тэхналогіі актыўнай ацэнкі, аўтар і сааўтар шматлікіх артыкулаў, якія выйшлі не толькі ў айчынным друку, але і ў педагагічных часопісах Беластока і Масквы. Ментар дыстанцыйных курсаў па актыўнай ацэнцы і медыяадукацыі. Перамагла ў конкурсе "Наўтбук для актыўнага настаўніка" (2010). Пад час летнікаў і курсаў у летніку рэалізована шмат ідэй, якія вылучыла гэта настаўніца. На курсах у летніку паспяхова выконвае ролю кансультанта, правяла цудоўны ўрок для дарослых па аповесці В.Быкава "Жураўліны крык"; разам з **Жвірко Жэнем** – Шляхецкі баль.

**Сучасныя метады і сродкі ацэнкі якасці адукацыі вучняў.** Тэма курсаў у летніку 2016 года. Звяртайцеся да кніг: Запрудский, Н.И. Контрольно-оценочная деятельность учителя и учащихся. – Минск: Сэр-Вит, 2012. – 160 с. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии-3. – Минск: Сэр-Вит, 2012. – 170 с. (глава 2). Актыўная ацэнка ў дзеянні: вопыт настаўнікаў Беларусі /М.І. Запрудскі, М.В. Кудзейка, Т.П. Мацкевіч, А.А. Радзевіч і інш. Мінск, 2014. – 324 с. Запрудскі, М.І., Сухава, Г.А. Дыялогі пра актыўную ацэнку. – Мінск: Сэр-Віт, 2018. – 170 с. Активная оценка в образовательном процессе школы/Под ред. Н.И. Запрудского – М.: Сентябрь, 2018. - 282 с.

**Такарская Валерыя** — настаўніца фізікі СШ № 149 г. Мінска. Кожны чалавек, які бывае ў нашым летніку стварае вакол сябя пэўную аўру, робіць свой адметны ўнёсак у наш альхоўскі дом. Валерыя Валянцінаўна ў гэтым сэнсе прыносіць надзвычай вялікую карысць. Многае ў нас робіцца выдатна, як у зместавым плане (па асноўнай тэме летніка), так і ў культурнай праграме, дзякуючы менавіта ёй. Яе ідэі і талент у многім вызначылі фармат і змест **«Альфі»**, **«Акадэміі»;** яе датскія вершы і песні ўпрыгожваюць наша тыднёвае свята ў Альхоўцы. Яна — адказны і вельмі надзейны чалавек.

**Тапаніміка**. У нашым летніку ёсць дзве вуліцы палатак: Бульвар Французкі (такая назва ад таго, што на ёй у большасці селяцца ўладальнікі французскіх аўто) і Азёрная — цягнецца ўздоўж возера. Яшчэ ёсць Шанхай – густа заселены ўчастак, які прымыкае да нашай паляны – месца правядзення **вучэбных заняткаў**, вячэры, **кацільёна** і інш.

**Творчая група настаўнікаў фізікі** пры **Акадэміі паслядыпломнай адукацыі**. Яе работу арганізуе **Канстанцін Пятроў.** У яе склад у большасці ўваходзяць настаўнікі – старажылы нашага летніка. Дарэчы, большасць педагогаў-фізікаў, якія сталі настаўнікамі-метадыстамі, да гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі прыходзілі праз навучанне ў альхоўскім летніку.

**Тэорыя і практыка абагульнення вопыту педагагічнай дзейнасці.** Тэма курсаў у летніку 2013 года. Карыснай будзе кніга: Запрудкий, Н.И. Педагогический опыт: обобщение и формы представления. – Мн.: Сэр-Вит, 2014. - 254 с.

**Традыцыі** летніка. На працягу 31 года (шляхам генерыравання і апрабацыі ідэй, спроб і памылак, адбору ўдалых знаходак) вызначаны элементы летніка, якія з'явіліся каркасам, асновай нашага тыднёвага свята ў Альхоўцы: 1) абавязковыя грунтоўныя **вучэбныя заняткі** па адной з актуальных праблем адукацыі, 2) **урачыстае адкрыцце з кругам знаёмства,** 2) інтэлектуальныя спаборніцтвы, 3) вечары адпачынку, 4) астранамічныя назіранні **з Уладзімірам Голубевым ,** 5) **начное арыентаванне,** 6) **канцэрт першагодкаў, 7) кніга рэкордаў,** 8) **"Акадэмія",** 9) **"Альфі",** 10) **Відэасалон,** 11) **Экскурсіі** і інш.

**Тэматыка курсаў у летніку.** З 1996 года ў змесце кожнага летніка асноўнай часткай з'яўляюцца аўтарскія курсы **Мікалая Запрудскага** па самых актуальных тэмах:

- тэхналагічны падыход у навучанні фізіцы (1996),
- асобасна арыентаваны падыход у навучанні фізіцы (1997),
- фізічны эксперымент у розных адукацыйных мадэлях (1998),
- навучанне вучняў уменням рашаць фізічныя задачы (1999),
- модульная тэхналогія навучання (2000),
- тэхналогія педагагічных майстэрань (2001),
- тэхналогія праектнага навучання (2002),
- інтэгральная тэхналогія вучэбна-выхаваўчага працэсу (2003),
- мадэліраванне і праектаванне аўтарскіх дыдактычных сістэм (2004),

- арганізацыя эксперыментальных даследаванняў вучняў (2005),
- стратэгіі навучання фізіцы ў профільнай школе (2006),
- кампьютэрная падтрымка вучэбна-выхаваўчага працэсу па фізіцы (2007),
- педагагічныя асновы і арганізацыя даследчай дзейнасці вучняў па праблеме энергазберажэння (2008),
- сучасныя сродкі навучання (2009).
– тэхналогія актыўнай ацэнкі (2010),
- арганізацыя самастойнай пазнавальнай дзейнасці вучняў (2011),
- тэорыя і практыка праблемнага навучання (2012),
- тэорыя і практыка абагульнення вопыту педагагічнай дзейнасці (2013),
- сучасныя электронныя сродкі навучання (2014),
- фарміраванне медыяграматнасці педагогаў і вучняў. Перавёрнутае навучанне (2015),
- сучасныя метады і сродкі ацэнкі якасці адукацыі вучняў (2016).
- метадычная работа ў в школе як механізм прафесійнага развіцця настаўнікаў (2017),
- дыдактычныя заданні як асноўны сродак арганізацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў – дыстанцыйна-вочны фармат (2018),
- праектнае навучанне як механізм забеспячэння якасці адукацыі вучняў — дыстанцыйна-вочны фармат (2019),

– крэатыўнасць настаўніка як умова развіцця творчых здольнасцей вучняў - дыстанцыйна-вочны фармат (2021).

**Тэндэнцыі летніка:**

· усё больш грунтоўныя практычныя выхады летніка: асвоеныя метады, вопыт, артыкулы, кнігі, новыя ідэі, абарона дысератацый, усё больш настаўнікаў-метадыстаў, альхоўцаў-пераможцаў у розных прафесійных конкурсах;
· усё больш жанчын размяшчаецца не ў інтэрнаце, а ў палатках непасрэдна ў летніку, на беразе Страчы;
· усё раней пачынаецца нулявы дзень. Жартуюць, што гадоў праз 20 ён можа пачацца яшчэ ў жніўні года заканчэння папярэдняга летніка,
· усё больш цудоўных людзей пападае ў махавік Альхоўкі, пры гэтым не абавязкова настаўнікаў фізікі;
· усё больш машын паркуецца каля палатак,
· усё менш рыбы ў возеры, усё радзей лес.

**Тэхналогія педагагічных майстэрань.** Аўтарскія курсы **Мікалая Запрудскага** па гэтай тэхналогіі праведзены ў летніку 2001 года. Дадзеная тэхналогія заключаецца ў спецыяльна арганізаваным педагогам-майстрам развіваючым асяроддзі, якое дазваляе вучням у індывідуальным і калектыўным пошуку «будаваць новыя веды». Майстэрня — гэта незвычайная форма правядзення вучэбных заняткаў. Яна складаецца з паслядоўнасці ўзаемазвязаных этапаў. На кожным з іх вызначальным з'яўляецца пэўнае вучэбнае заданне (індуктар), якое накіроўвае пазнавальную дзейнасць дзяцей. Адным з «прадуктаў» курсаў стала кніга: Запрудский Н.И. Технология педагогических мастерских. – Минск—Мозырь: АПО — ИД «Белый ветер», 2002.

**Урачыстае адкрыцце летніка.** Яно захавала да апошняга часу свой фармат і змест. Гэта — круг знаёмства (хто я, чым буду цікавы для іншых, што прывяло мяне ў летнік і г.д.), вітанні, падарункі, чытанне пасланняў з папярэдняга летніка, пад'ем сцяга, наша песня:

«А если станет трудно - ведь в жизни всё не просто,
Не трать напрасно нервы, не куксись и не злись.

А просто тихо вспомни Ольховку девяностых:
Как здорово, что все мы здесь сегодня собрались» (Г. Клебанов)

**Унуковіч Галіна** — настаўніца гімназіі г. Астравец. Яна была ў ліку стваральнікаў летніка. Менавіта, на курсах у Альхоўцы яна авалодала інтэгральнай адукацыйнай тэхналогіяй і паспяхова прымяняе яе на сваіх уроках. Галіна Віктараўна — аўтар артыкулаў у часопісах **«Фізіка: праблемы выкладання»** і «Физика в школе», яна выпусціла кніжку дыдактычных матэрыялаў для 7 класа. Галіна Унуковіч вельмі цэніць тое сяброўства і партнерскія сувязі, якія ўзніклі ў летніку.

**Фарміраванне медыяграматнасці педагогаў і вучняў**. **Перавернутае навучанне.** Тэма курсаў у леніку 2015 года. Карысны дапаможнік: Медыяадукацыя ў школе: фарміраванне медыяграматнасці вучняў: дапаможнік для настаўнікаў / М.І. Запрудскі, Т.П. Мацкевіч,А.А.Палейка, А.У. Радзевіч, і інш.; пад рэд. М.І. Запрудскага. – Мінск, 2016. – 336 с. http://svetlana-yan.blogspot.com/2016/09/blog-post_28.html

**Фізіка: праблемы выкладання** (зараз **«Фізіка»**) — навукова-метадычны часопіс для настаўнікаў фізікі. Выходзіць з 1995 года. Галоўны рэдактар – **Мікалай Запрудскі**. Журнал з'яўляецца інфармацыйным спонсарам летніка ў Альхоўцы. У сваіх цудоўных артыкулах пра падзеі ў летніку пісалі: Святлана Жыгала і Святлана Здаранкова (2019 год), Таццяна Афанасік (2018 год), Аляксандр Яўсееў, Сяргей Талмачоў (2016 год), **Эла Якубоўская** (2012 год), **Ніка Цішчанка** (2011 год), Святлана Каўганка (2010 год), **Віктар Герцык** (2009 год), **Саша Плятнеў,** Вольга Шчасновіч (2008 год), **Віктар Кірэеў** (2007 год) Ірына Катлова (2006 год), Сяргей Федарына (2005 год), Аліна Філатава (2004), Уладзімір Паддубскі (2003), **Святлана Дзюбенка** (2002 год), Алена Клачкова (2001 год), **Марына Катлярова** (2000 год), **Ніна Дашчонак** (1999 год), **Ганна Гадлеўская** (1998 год), **Аля Шалудзякова** (1997 год), **Юрый Шчасны** (1996 год).

**Фізічна-спартыўная паласа перашкод**. Ужо праводзілася 30 разоў. І заўседы па-новаму. Аўтар-арганізатар – **Мікалай Запрудскі**. Ідэя гэтых спаборніцтваў заключаецца ў тым, што каманды па чарзе прабягаюць маршрут і пры гэтым выконваюць заданні па фізіцы. У 2010 годзе нават была фізічна-філалагічная паласа, калі адным з яе аўтараў была **Галіна Сухава.** Апошнія гады на паласе шмат крэатыўных заданняў. Пазнаёміцца з тым, як арганізоўваліся спаборніцтвы, можна па кнізе **Мікалая Запрудскага** «Весёлые соревнования по физике» (Минск, «Конкурс», 2009). https://www.bakonkurs.by/books/books_author.php?a=61.

**Фінансаванне**. Амаль кожны год мы знаходзілі спонсараў. Але не заўсёды. Некаторыя ўдзельнікі атрымліваюць камандзіровачныя грошы.

**Фотаальбом**. У альбоме змешчаны фатаграфіі з нашых летнікаў. Можа быць Вы, чытачы, некага пазнаеце? Найбольшы ўнёсак у наш фатаграфічны зборнік робяць **Анатоль Аўсейчык** і Святлана Здаранкова. Глядзіце:

Альхоўка-2021 24-28.06.2021: https://photos.app.goo.gl/4yRuoQWCJLiTDVzu5

Альхоўка-2021 29.06-3.07.2021: https://photos.app.goo.gl/vhgw9kcb7CVdx3oLA

Альхоўка -2019 https://photos.app.goo.gl/4r1gYiz44spS9ZhA8

**Хроніка курсаў у летніку.** «Альхоўка-2013». XXVIII методический летнік "Альхоўка-2017". XXIX методический летнік "Альхоўка-2018". XXX методический летнік "Альхоўка-2019". XXXI методический летнік "Альхоўка-2021"

**Харчаванне.** Сняданак і абед – у школьнай сталовай, а вячэра – каля вогнішча на нашай паляне. Яшчэ бываюць кава-паўзы.

**Хатомля –** возера ў Крулянскім раёне, на беразе якога **Яўгенія Лазарэнка** ладзіць фестываль педагагічнага майстэрства “Творчыя канікулы”. Падзея адбываецца штогод у сярэдзіне жніўня. Удзельнікі – настаўнікі фізікі Магілёўскай вобласці. Бываюць госці з іншых рэгіёнаў краіны. Гэты фестваль можна лічыць малодшай сястрой нашага летніка на **Страчы.** Справаздачы чытайце ў журнале **“Фізіка”**

**Цішчанка Ніка**. Працуе настаўніцай фізікі ў пятай гімназіі г. Віцебска. Яе каманда паспяхова ўдзельнічала ў рэспубліканскім ТЮФ. Друкавала артыкулы ў нашым часопісе.

**Чабатароў Яўген Уладзіміравіч** — былы дырэктар Альхоўскай сярэдняй школы. Ён доўгі час падтрымлівае нас, дапамагае нам у гаспадарчых справах. Мы карыстаемся яго лодкай. Чалавек вельмі шчодры, адначасова сціплы і інтэлігентны. Сябра ўдзельнікаў летніка.

**Чыгір (Кітова) Ларыса** — былая настаўніца агратэхнічнага каледжа імя К. П. Арлоўскага, што знаходзіцца ў а.г. Буйнічы каля г.Магілева. Выдатнік адукацыі. Яна прыехала ў Альхоўку ўпершыню 1991 годзе і больш не змяняла спосаб павышэння свайго прафесіяналізму і адпачынку — курсы ў летніку. 25 разоў была ў нашым летніку. Яна сваёй асобай упрыгожвае альхоўскае спадарства. Пры гэтым яна, як і многія, тое, чым авалодала на курсах, паспяхова прымяняла на сваіх занятках, аб чым сведчаць, у прыватнасці, яе публікацыі ў прадметным часопісе і распавядаюць калегі. Па матэрыялах курсаў у летніку апісала сваю аўтарскую дыдактычную сістэму “Практычная педагогіка развіццёвага тыпу”. Ларыса Мікалаеўна – умелы арганізатар прафесійнай камунікацыі; на працягу 10 гадоў выдатны арганізатар харчавання ўдзельнікаў; знакаміты закройшчык (палатняныя шапкі для **акадэмікаў** — гэта яе справа). У той год, калі **Анатоль Шуба** выбіраўся у **Акадэмію,** ён прывёз шмат чорнай тканіны і з таго часу нашы акадэмічныя шапкі сталі сапраўднымі. Наша Ларыса Мікалаеўна ведае дні нараджэння многіх ветэранаў летніка, нумары тэлефонаў -— яна своеасаблівы інфармацыйны даведнік Альхоўкі. Першыя відыяфільмы з летніка – гэта таксама справа **Ларысы Чыгір (Кітовай).**

**Шалудзякова Аля** — была намеснікам дырэктара СШ № 56 г. Гомеля, Сорасаўскі настаўнік, нястомны педагог, які пастаянна знаходзіцца ў пошуку. Каманда фізікаў з яе школы, якую ўзначальвала Аля Анатольеўна, паспяхова выступала на рэспубліканскім турніры юных фізікаў, дзе не згубілася на фоне каманд ліцэя БДУ. Яе вучні ўдзельнічалі ў канферэнцыях даследчых работ, летняй фізіка-матэматычнай школе ў Лужасне. **Аля Шалудзякова** — аўтар публікацый у прадметным часопісе, а таксама ў журнале «Кіраванне ў адукацыі». Яна вельмі шмат зрабіла для нашага летніка. Казалі так: «Калі ёсць Аля Анатольеўна, то ўсё будзе змястоўна, інтэлігентна і прыгожа». Сёння яна шмат часу прысвячае фотамастацтву. Былі праведзены дзве персанальныя выставы. Пашукайце ў інтэрнэце яе цудоўныя фота. Не пашкадуеце.

**Шанаванне гасцей летніка.** Мы заўседы з радасцю сустракалі на нашай паляне дырэктара Альхоўскай школы **Яўгена Уладзіміравіча Чабатарова**, яго жонку — настаўніцу [Тамару Уладзіміраўну], цяперашняга дырэктара Альхоўскай школы – **Сяргея Анатольевіча Гаўрыловіча**, дырэктара Міхалішкоўскай школы **Віктара Казіміравіча Казака,** загадчыкаў РАА Уладзіміра Булавіцкага, Лілію Янкоўскую, Віктара Млечку; генеральнага дырэктара ВД «Белы вецер» Пятра Шумскага, паветраплавальнікаў Алега Давыдзенка і Аляксандра Фірсакова, намесніка дырэктара выдавецтва «Сэр-Віт» Тамару Дрозд, кансультанта МА **Наталлю Гаравую**, прарэктара АПА Ірыну Аляксандраўны Дзюбу, загадчыцу кафедры педагогікі і менеджмента адукацыі АПА Таццяну Андрэеўну Лапацік; гасцей з іншых краін:

Андрэя Тарчэўскага, Рыму Кашчэеву, Рыгора Шустэфа, Алену Дворак і іншых VIP-персон.

**Шуба Анатоль.** На вялікі жаль, у 2020 годзе мы яго пахавалі**.** Вельмі шмат карыснага зрабіў для адукацыі нашай краіны, калі ўзначальваў Міжнарожную Сорасаўскую Адукацыйную Праграму ў Галіне Дакладных Навук (ISSP). Можна гаварыць, што, менавіта, дзякуючы яму, многія педагагічныя мерапрыемствы на Беларусі ўсё часцей праводзяцца на падставе такіх прынцыпаў, як 1) самавызначэнне педагогаў на ўдзел у семінары або канферэнцыі, 2) забеспячэнне ўдзельнікаў неабходнымі метадычнымі матэрыяламі. Пры фінансавай падтрымцы ISSP была створана Беларуская Асацыяцыя Настаўнікаў Фізікі, выдавалася шмат кніг, праводзіліся інтэлектуальныя спаборніцтвы вучняў і г.д. У нашым летніку ён быў 26 разоў, праводзіў **кацільён**, актыўнічаў у іншых мерапрыемствах. Анатоль Аляксандравіч застаецца з намі, застаецца ў сэрцах тых альхоўцаў, якія доўгія гады ведалі яго як сапраўднага інтэлігента, чалавека высокай культуры, таленавітага майстра чалавечых зносін.

**Шчасны Юрась** — Сорасаўскі настаўнік, настаўнік фізікі СШ № 19 г. Брэста. Такія альхоўцы, як Юра, з'яўляюцца тым "чалавечым фактарам", які цэментуе будынак "альхоўскага" дома. Сваёй асобай, талентам узаемін Юрый Аляксандравіч аб'ядноўвае людзей, матывуе іх на добрыя справы. Ён праявіў сябе і як арганізатар, і як добры фізік, і як выканаўца гумарыстычных маналогаў, і як вядучы на **свяце "Купалле"**. Ю.А. Шчасны — адзін з аўтараў часопіса **"Фізіка: праблемы выкладання"**, дзе ен, у прыватнасці, змясціў артыкул пра летнік у **Альхоўцы.**

**Шумскі Віктар** — дырэктар, настаўнік фізікі з СШ № 4 г. Старыя Дарогі Мінскай вобласці. Ён заўседы вельмі жаданы ў летніку чалавек. Аўтар артыкулаў у часопісе "**Фізіка: праблемы выкладання",** а таксама вершаў і песен, якія выконваюцца вечарам каля вогнішча.

**Шумскі Петр** — генеральны дырэктар ВД "Белы вецер". Спонсар нашага летніка, які прывозіў у Альхоўку бібліятэчкі літаратуры (для школы і аддзела адукацыі), сувеніры удзельнікам, падарункі школе. Больш таго, многія ўдзельнікі летніка (**Валерый Барашкаў, Мікалай Запрудскі**, Альбіна Кісялева, **Валерыя Такарская**, **Галіна Унуковіч** і інш.) выдалі ў "Белым ветры" свае вучэбна-метадычныя дапаможнікі для вучняў і настаўнікаў.

**Экскурсія**. Амаль за суткі да завяршэння летніка, у суботу ў 10 гадзін раніцы мы на 12 — 15 машынах едзем на экскурсію па знакавых мясцінах Астравеччыны і суседніх раёнаў. Былі ў Гервятах і Рымдзюнах, у Варнянах, Міхалішках, Быстрыцы, на Блакітных і на Сарачанскіх азёрах, на возеры Нарач, побач з АЭС, у Астраўцы, на радзіме М.Агінскага ў Залессі. У 2022 годзе мяркуем паехаць у Лынтупы Пастаўскага раёна. Паглядзіце ў інтэрнэце, там ёсць чаму падзівіцца. Натхняльнік і арганізатар тут — **Анатоль Аўсейчык.**

**Эксперыментальныя даследаванні вучняў**. Такая тэма курсаў у летніку была вызначана з-за таго, што ў вучэбную праграму па фізіцы былі ўключаны эксперыментальныя даследаванні. У выніку **Мікалаем Запрудскім,** Андрэем Карпуком, **Канстанцінам Пятровым** і **Валерыяй Такарскай** былі падрыхтаваны і выдадзены выдавецтвам «Сэр-Віт» спецыяльныя сшыткі для вучняў. Дарэчы, яны атрымалі грыф Міністэрства адукацыі.

**Энцыклапедыя летніка ад А да Я** — гэта тэкст, які вы, калега, зараз чытаеце.

**Юшка** ў нас варыцца і ўдзельнікі ей частуюцца, калі **Валерыю Барашкаву, Сяргею Гарбацэвічу, Аляксандру Якубоўскаму** і іншым нашым рыбакам удаецца налавіць

рыбы. Аднойчы першы з гэтага спіса аматараў рыбнай лоўлі злавіў шчупака, які змясціўся ў баначцы ад маянэзу.

**Якубоўскія Эла і Аляксандр**. Жодзінскія настаўнікі: Эла працуе ў гімназіі, Аляксандр – у школе № 9. Абодва настаўнікі-метадысты. Яна абараніла магістарскую дысертацыю. Эла Мікалаеўна – аўтар шматлікіх артыкулаў, аўтар кніг па медыяадукацыі, якія выдадзены і ў нас, і на Украіне. Праводзіць майстар-класы, іншыя заняткі ў АПА і МАІРА. На курсах у летніку паспяхова выконвае ролю кансультанта. Ментар дыстанцыйных курсаў па актыўнай ацэнцы і медыяадукацыі. Член суполкі настаўнікаў-метадыстаў "Імкненне". Аляксандр трэніруе каманду Мінскай вобласці на заключны этап фізічнай алімпіяды. Рыбак, аўтамабіліст, пад яго кіраўніцтвам у летніку арганізуецца **лазня**.

**Я вам дасылаю свае прывітанні/пажаданні.** Падчас урачыстага закрыцця летніка **Юра Шчасны** па традыцыі хаваў ў зямлю пад дрэвам слоік, у якім знаходзіліся лісты з пажаданнямі наступным удзельнікам курсаў у Альхоўцы. Для прыкладу прыводзім запісы, якія пакінулі «нашчадкам» альхоўцы 6 ліпеня ў апошні год мінулага стагоддзя. Амаль праз год, 1 ліпеня, адкрываючы новы летнік, мы іх прачыталі:
· Ольховцы! Если вы сейчас здесь нашли и читаете эту записку, значит всё в порядке! Ура!!!!
· Рада буду бачыць вас у 2001 годзе (Подпіс неразборлівы).
· Усіх вельмі-вельмі люблю. Адчуваю асалоду ад сустрэчы. (Чачэнін з-пад Брэста).
· 11-я Альхоўка, гарачае лета запомніцца надоўга. Няхай будзе 12-ы летнік. Да сустрэчы.

Я так хочу, чтобы Ольховка не кончалась,
Чтобы мысль не истощалась
У нас у всех.
Я так хочу, чтобы все друзья встречались,
Чтобы все они общались,
Чтобы дела все получались,
И в новый век! Лера.

- Улетаю, чтобы снова вернуться. Уже сейчас жду встречи со всеми ольховитянами. Искренне Ваша-Нэ-Нэ-Нэ Баскет. 6.07. 2000.
· Працуйце, дзяліцеся, дапамагайце, расслабляйцеся, адпачывайце, сумуйце, прыязджайце.
· Жадаю імклівага развіцця фізікам і фізіцы, методыцы і тэхналогіям: Жадаю бачыць усіх альхоўцаў шчаслівымі, прызнанымі калегамі і начальствам. А.Г. · Быць тут праз год (Подпіс неразборлівы).
· Вітаю цябе, Альхоўка! Шаноўныя сябры. Жадаю вам выдатна адпачыць і папрацаваць. Усіх вас люблю. Вольга Зв.
· Гэта самыя цікавыя і цудоўныя дні майго жыцця. Тут самыя добрыя сябры. (Подпіс неразборлівы).
· Сябры мае, як хочацца, калі вы чытаеце гэтыя радкі, каб я быў разам з вамі ў нашым крузе. Як хочацца перажыць гэты тыдзень радасці яшчэ раз! Жадаю ўсім радавацца ўзаемінамі, набірацца сіл на новы навучальны год і зноў балдзець на гэтай цудоўнай зямлі Альхоўкі. Віват Альхоўка-2001. (Подпіс неразборлівы).
· Маладзее Альхоўка разам з намі. Няхай так будзе заўжды. Журба.
· Жыве Альхоўка! Усім вярнуцца праз год, новых ідэй, творчых поспехаў, кахання. Расшырыць склад каманд у спаборніцтвах. Паласу жахаў зрабіць яшчэ больш жахлівай, паласу асалодаў яшчэ больш салодкай. Яснага неба, цяпла, многа вады і рыбы ў Страчы.

**Даеш трыццаць другую Альхоўку!!!**